# БЕЛАРУСКІ ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ ТЭКСТ У ПЕРЛАКУТЫЎНЫМ АСПЕКЦЕ

***Ю. В. Маліцкі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Malitski@bsu.by*

Разглядаюцца асаблівасці беларускага публіцыстычнага тэксту ў аспекце рэалізацыі яго перлакутыўных характарыстык. Даецца рэтраспектыва развіцця беларускага публіцыстычнага тэксту, вылучаюцца яго асноўныя мэтавыя прагматычныя ўстаноўкі ў сувязі з падзеямі айчыннай гісторыі, аналізуюцца зместава-фармальныя сродкі маўленчай актуалізацыі рыс грамадскай функцыянальнасці.

***Ключавыя словы:*** тэкст; публіцыстычны тэкст; лакуцыя; ілакуцыя, перлакуцыя.

# БЕЛОРУССКИЙ ПУБЛИЦИСТИЧЕСКИЙ ТЕКСТ В ПЕРЛОКУТИВНОМ АСПЕКТЕ

***Ю. В. Малицкий***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*Malitski@bsu.by*

Рассматриваются особенности белорусского публицистического текста в аспекте реализации его перлокутивных характеристик. Дается ретроспектива развития белорусского публицистического текста, выделяются его основные целевые прагматические установки в связи с событиями отечественной истории, анализируются содержательно-формальные средства речевой актуализации черт общественной функциональности.

***Ключевые слова:*** текст; публицистический текст; локуция; илокуция, перлокуция.

Логіка гістарычнай трансфармацыі беларускага тэксту (пад гэтым паняццем мы разумеем беларускамоўны тэкст) вызначаецца канкрэтнымі падзеямі і этапамі развіцця беларускай нацыі. На гэтым шляху ён выступаў сродкам непасрэднага ўплыву на аб'ектыўны стан рэчаў, а, часам – і дзейсным інструментам канструявання рэальнасці. Выразная функцыянальная скіраванасць вызначала асноўныя прынцыпы маўленчай арганізацыі тэксту – шляхі выкладу і структуравання інфармацыі, характар выбудоўвання логікі змястава-кампазіцыйных сувязей, спосабы выяўлення аўтарскіх адносін да з'яў рэчаіснасці, арсенал мастацкіх прыёмаў, склад маўленчых сродкаў, адэкватных камунікатыўным абставінам, мэтавай аўдыторыі і г. д. Вытокі тэкстаў, што мелі першачарговай мэтай данясенне інфармацыі і фарміраванне ў чытача пэўных адносін да яе, бяруць пачатак у часы распаду Кіеўскай Русі. Сярод іх «Слова аб Законе і Благадаці» мітрапаліта Іларыёна (сярэдзіна XI ст.), «Казанне пра Барыса і Глеба» (XI–XII ст.), «Аповесць мінулых гадоў» (пачатак XII ст.), «Слова аб палку Ігаравым» (XII ст.), «Жыціе Ефрасінні Полацкай», «Жыціе Аўрамія Смаленскага» (XII–XIII ст.) і інш. Названыя творы засведчылі пачатак фарміравання сістэмы спосабаў канструявання тэкстаў у сувязі з іх функцыянальным прызначэннем.

Нягледзячы на нязначны ўплыў, які аб'ектыўна былі здольныя аказаць існуючыя ў адзінкавых экзэмплярах старажытныя рукапісныя творы на пераважна непісьменнае грамадства, відавочным з'яўляецца тое, што ў сілу тагачасных уяўленняў аб сакральнасці пісьменства на іх ускладалася важная функцыя легітымізацыі існуючай улады, пацвярджэння правамернасці яе дзеянняў.

Публіцыстычнасць тэксту як арганізацыйны прынцып твораў беларускай літаратуры і як інструмент ўплыву на аб'ектыўную рэчаіснасць больш поўна выявілася ў XVI–XVII ст. Рэлігійна-ідэалагічнае супрацьстаянне каталіцызму і праваслаўя на этнічных беларускіх землях, наступствы Берасцейскай уніі (1596) паслужылі магутным рухавіком для з'яўлення старабеларускіх тэкстаў, прысвечаных нацыянальна-рэлігійным праблемам Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Займаючы актыўную грамадзянскую пазіцыю, абараняючы культурныя і палітычныя інтарэсы насельніцтва беларускіх зямель у часы Рэфармацыі і Контррэфармацыі, аўтары каментарыяў да богаслужэбных тэкстаў, памфлетаў, зваротаў, адкрытых лістоў, трактатаў, адозваў

і іншых форм тагачаснай грамадскай камунікацыі адстойвалі права народа на рэлігійнае самавызначэнне, узнімалі пытанні арганізацыі дзейнасці царквы як сацыяльнага інстытута, прама ці ўскосна закранаючы праблемы класавай няроўнасці, эканамічнай эксплуатацыі, нацыянальнага прыгнёту і г. д. Беларуская палемічная літаратура эпохі Рэнесансу канчаткова сфарміравала ўяўленне аб тэксце як аб форме ідэалагічнай барацьбы і інтэлектуальнай зброі.

Тэктанічныя сацыяльныя і эканамічныя зрухі ў сярэдзіне XIX ст. вызначылі адпаведныя гістарычным абставінам формы звароту да насельніцтва беларускіх земляў. На пярэдадні і пасля выхаду лёсавызначальнага маніфеста 1861 г. «О всемилостивейшем даровании крепостным людям прав состояния свободных сельских обывателей» папулярным сродкам грамадскай камунікацыі сталі так званыя гутаркі – белетрызаваныя мастацка-публіцыстычныя творы выразнай сацыяльнай накіраванасці. Ва ўмовах, калі беларускае слова было выцеснена з афіцыйнага грамадскага ўжытку, яны надалі народна-гутарковай мове статус сродку агульнанацыянальнай камунікацыі і заклалі базавыя прынцыпы фарміравання айчыннай інфармацыйнай прасторы. Яны ў даступнай форме раскрывалі сутнасць сацыяльных і эканамічных змен, спрыялі фарміраванню пункту погляду беларускага сялянства на гэтыя змены.

Цэнтральнае месца ў грамадска-палітычнай тэматыцы айчынных выданняў пачатку XX ст. заняла ідэя адраджэння беларускай дзяржавы. У 1906 г. пачала выходзіць газета «Наша доля». Кожны перадавы артыкул газеты быў значнай вяхой у развіцці айчыннай публіцыстыкі. Артыкулы «Што будзе» і «Даход расейскага цара» высока ўзнялі стандарты беларускай аналітыкі, а рэзанансны артыкул «Як мужыку палепшыць сваё жыццё», надрукаваны ў другім і трэцім нумарах, стаў сапраўднай інструкцыяй у справе стварэння саюзаў працоўных і сялян для барацьбы за лепшае жыццё.

Першыя два дзесяцігоддзі савецкай улады без перабольшання можна назваць пачаткам пабудовы беларускай дзяржавы ў новых гістарычных умовах, і перыядычныя выданні сталі эфектыўным інструментам гэтага працэсу. Значнай падзеяй у фарміраванні сістэмы беларускіх сродкаў масавай інфармацыі была дзейнасць першай савецкай беларускамоўнай газеты «Дзянніца» (пачала выдавацца ў пачатку 1918 г.). Рэдакцыя газеты падтрымлівала і развівала ідэю стварэння беларускай дзяржаўнасці,

тлумачыла чытачам асноўныя задачы беларусаў у справе ўмацавання заваёў Кастрычніцкай рэвалюцыі і дасягнення самавызначэння рэспублікі. Аўтарытэт выдання ў вялікай ступені быў абумоўлены асобай рэдактара – вядомага пісьменніка і публіцыста Зміцера Жылуновіча. Ён быў аўтарам праграмных артыкулаў, прысвечаных дзяржаўнаму ўладкаванню («Аб нацыянальным руху», «Нашы задачы» і інш.). Творы З. Жылуновіча мелі выразны аналітычны і навукова-тэарэтычны характар і аказалі істотны ўплыў на ход палітычнага працэсу ў Беларусі.

Вектар функцыянальнай скіраванасці беларускай публіцыстыкі часоў Вялікай Айчыннай вайны відавочны. Праграмныя перадавыя артыкулы выданняў ваеннага часу падтрымлівалі полымя ідэйнай барацьбы супраць фашызму, даводзілі думку аб непазбежным вызваленні беларускай зямлі ад гітлераўскіх акупантаў. Асаблівае месца ў працэсе развіцця беларускамоўнага публіцыстычнага тэксту займае дзейнасць франтавой газеты «За Савецкую Беларусь», якая выходзіла з ліпеня 1941 г. па снежань 1942 г. Адметнай рысай газеты сталі навіны партызанскага руху на Беларусі, глыбокая аналітыка па пытаннях міжнароднага становішча. Такія матэрыялы пашыралі ракурс погляду чытача на падзеі, фарміравалі ўяўленне аб змаганні беларусаў у партызанскіх атрадах і ў Чырвонай Арміі як аб укладзе ў сусветную барацьбу з фашызмам.

Асноўным вынікам першых пасляваенных дзесяцігоддзяў стала паспяховае пераадоленне савецкім грамадствам наступстваў вайны. Важную ролю ў гэтым адыгрываў беларускі друк і радыёвяшчанне, якія былі важным фактарам канструявання сацыяльных працэсаў і аб’ектыўных пераўтварэнняў. Магістральным напрамкам айчыннай публіцыстыкі ў гэты перыяд стала вырашэнне актуальных пытанняў народнай гаспадаркі. У 1950-х гг. гэта былі пытанні аднаўлення і росту аб’ёмаў вытворчасці, вырабу ў неабходнай колькасці электраэнергіі для прамысловых прадпрыемстваў і сельскай гаспадаркі. У 1960-х гг. у фокус увагі беларускіх публіцыстаў трапіла праблема дэмаграфіі беларускай вёскі, адток моладзі ў горад, у 1970-х – пытанні жыллёвай палітыкі і горадабудаўніцтва.

Працэсы дэмакратызацыі савецкага грамадства ў другой палове 1980-х гг., сталі прычынай карэкцыі сацыяльнага статусу сродкаў масавай камунікацыі і істотным чынам паўплывалі на прынцыпы публіцыстычнай дзейнасці. Галоснасць як вызначальны прынцып перабудовы зрабіў адкрытымі для абмеркавання ў прэсе такія вост-

рыя грамадскія праблемы, як аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі і яе наступствы для нашай краіны, рэпрэсіі супраць беларускай навуковай і творчай эліты ў 1930–50-я гг. і інш. Пашырэнне тэматычнага спектра айчыннай публіцыстыкі паспрыяла росту цікавасці да гісторыі Беларусі, што ў выніку падрыхтавала ідэалагічную базу для абвяшчэння суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Сёння аналітычныя, дыскусійныя тэксты сацыяльнай накіраванасці не згубілі сваёй ролі і па-ранейшаму з'яўляюцца адным з найважнейшых сродкаў фарміравання дзяржаўнасці. Сучасная беларуская публіцыстыка ва ўсёй разнастайнасці сваіх форм выконвае кансалідуючую функцыю, вырашае палітычныя, эканамічныя і сацыяльна-культурныя задачы ў адпаведнасці з запытам грамадства і дзяржавы. Доказам гэтага з'яўляюцца заканадаўчыя акты, якія рэгулююць механізм непасрэднага ўзаемадзеяння сродкаў масавай камунікацыі і дзяржавы ў справе забеспячэння высокіх стандартаў жыцця. Так, Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 630 ад 5 снежня 1997 г. «Аб рэагаванні службовых асоб на крытычныя выступленні ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі» (з 3 снежня 2024 г. у выніку актуалізацыі з улікам сучасных тэндэнцый развіцця інфармацыйнай сферы выкладаецца ў новай рэдакцыі) вызначае парадак сумесных дзеянняў рэдакцый дзяржаўных СМІ і органаў улады, накіраваных на выяўленне і ліквідаванне праблем, аб якіх паведамляецца ў грамадска значнай інфармацыі. Прадугледжаныя Указам нормы дазваляюць «узмацніць узаемадзеянне дзяржорганаў, СМІ і экспертнай супольнасці па інфармаванні насельніцтва, у тым ліку аб праблемных пытаннях і шляхах іх вырашэння» [1].

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Об изменении Указа Президента Республики Беларусь (корректируется Указ № 630 от 5 декабря 1997 г.) Указ № 452 от 3 декабря 2024 г. URL: https://president.gov.by/ru/documents/ukaz-no-452-ot-3-dekabra-2024-g (дата звароту: 23.06.2025).